Школа актыўнага грамадзяніна

ВАС, ЯК НІДЗЕ, ЧАКАЮЦЬ ДОМА

Старшакласнікі разважалі пра сябе, сваіх равеснікаў і краіну

На адзіны дзень інфармавання пад агульным дэвізам «Школа актыўнага грамадзяніна» ў СШ № 8 Брэста старшакласнікі сабраліся ў актавай зале. Музей у гонар выпускніка школы, першага Героя Беларусі Уладзіміра Карвата, стаў своеасаблівым цэнтрам патрыятычнага выхавання. Але гэтым разам тэма для абмеркавання была больш шырокая. Да таго ж у школу завітала госць — цяжкаатлетка, заслужаны майстар спорту, ганаровы грамадзянін Брэста Ірына КУЛЕША.

У музеі школы.

Тэма агульнарэспубліканскай палітінфармацыі гучала так: «Беларусь сёння: захоўваючы і памнажаючы добрыя традыцыі». Спачатку згадалі рэспубліканскі навагодні баль у Палацы Незалежнасці. Уключылі відэа, дзе кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да моладзі, просіць памятаць юнакоў і дзяўчат: «дзе б яны ні апынуліся па справах работы, вучобы альбо пошукаў сябе, іх ніхто нідзе не будзе чакаць так, як дома».

І дзеці, спачатку нясмела, сталі развіваць гэтую тэму, гаварыць пра свой дом і малую радзіму. Дыскусію ўмела накіроўвала мадэратар — **настаўніца гісторыі Алена КІТЛЕНКА.** Найбольш актыўнічалі дзяўчынкі — яны дзяліліся меркаваннямі аб тым, за якія заслугі трапляюць на рэспубліканскі баль.

Пра спорт гаварылі больш актыўна. Аказалася, у міліцэйскіх класах школы ёсць сапраўдныя аматары хакея. Яны ведаюць амаль на памяць усе каманды як Каляднага турніру, так і спаборніцтваў «Залатая шайба». Загаварылі і аб тым, як спорт збліжае народы. А яшчэ пра тое, як цікава быць балельшчыкам і перажываць эмоцыі ў працэсе гульні.

Ірыне Кулешы задавалі шмат пытанняў. Школьнікаў цікавілі стасункі з роднай школай майстра спорту. Напрыклад, ці ходзіць яна на вечары сустрэчы, ці падтрымлівае сувязь з аднакласнікамі. А калі даведаліся, што муж Ірыны Міхайлаўны — яе школьнае каханне, дзяўчынкі весела азірнуліся на аднакласнікаў і — наадварот. У канцы сустрэчы адзінаццацікласніца Дзіна Загрэба бліскуча правяла для госці экскурсію па музеі Уладзіміра Карвата і запрасіла спартсменку часцей прыходзіць у 8-ю школу.

Намеснік дырэктара школы па выхаваўчай рабоце Жанна ЛАПЫКА пасля мерапрыемства адзначыла, што, на яе здзіўленне, некаторыя з вучняў падчас дыскусіі крыху разгубіліся.

— Але гэта нармальна. Дзеці набываюць вопыт стасункаў у большай аўдыторыі чым клас, — дапоўніла калегу Алена Кітленка. — Цяпер жа асноўная частка іх зносінаў — у сацыяльных сетках, а каб гаварыць ужывую, тым больш перад аўдыторыяй, неабходная пэўная смеласць. Вось для гэтага і патрэбныя падобныя мерапрыемствы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ СУБОТНІЯ ЗВАНКІ

Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца сёння, 26 студзеня, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. З 9.00 да 12.00 іх правядуць:

кіраўнік спраў БРЭСЦКАГА аблвыканкама Георгій Мікалаевіч ХВАЛЬКО. Тэл. 8 016 221 31 21;

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ. Тэл. 8 015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Іванавіч ХАРЫТОНЧЫК. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

II Еўрапейскія гульні прызнаны самай значнай кантынентальнай спартыўнай падзеяй 2019 года

Гэта стала вядома па выніках апытання папулярнага рэсурсу Inside the Games. Арганізатары галасавання прапанавалі чытачам сайта на выбар чатыры варыянты: II Еўрапейскія гульні ў Мінску, Афрыканскія гульні ў Рабаце (Марока), Панамерыканскія гульні ў Ліме (Перу) і Ціхаакіянскія гульні ў Апіі (Самоа). Балельшчыкі аддалі 93,45 % галасоў за спартыўны форум у Беларусі.

Inside the Games — інтэрнэт-выданне, якое спецыялізуецца на асвятленні спартыўных падзей і алімпійскага руху.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ЧАС ПАДАВАЦЬ ДЭКЛАРАЦЫЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У адносінах да аб'ектаў камерцыйнай нерухомасці колькаснай падатковай ільготы не існуе. Калі ўласнік прадаў нават адно гандлёвае, офіснае ці адміністрацыйнае памяшканне, ён абавязаны запоўніць дэкларацыю.

Ёсць выключэнне з правілаў. Прадаваць у кароткі тэрмін можна любую колькасць машын, дамоў, дач або зямельных участкаў і іншую нерухомасць, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. Плаціць падаткі ў гэтым выпадку не трэба незалежна ад перыядычнасці адчужэння нерухомасці на працягу пяцігадовага перыяду.

ЗАРОБКІ З-ЗА МЯЖЫ

Эксперты падатковай галіны асобна адзначаюць, што абавязкова дэкларуюцца любыя даходы, што былі атрыманы за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны.

Гэта могуць быць грошы ад працы па найме (кантракце), ад продажу акцый або іншых каштоўных папер, ад продажу доляў у статутных фондах замежных арганізацый, у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках, атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян і іншае.

Фактычна выплачаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы сумы падатку з даходаў, атрыманых там (за выключэннем даходаў, атрыманых з афшорных зон), залічваюцца пры вызначэнні сумы падаходнага падатку, які трэба заплаціць у Беларусі. Тут існуе адзін нюанс. Такі залік ажыццяўляецца работнику пры ўмове, што ён падасць дакумент аб атрыманым даходзе і ўтрыманым падатку, пацверджаны падатковым ці іншым кампетэнтным органам замежнай краіны.

Такое пацвярджэнне даецца фізічнай асобай альбо ў момант падачы падатковай дэкларацыі, альбо на працягу аднаго года з дня падачы заявы аб правядзенні заліку падатку, які быў аплачаны ў бюджэт замежнай дзяржавы.

ЛІЧЫМ ПАДАРУНКІ

Падлічваць за год трэба і тыя прыбыткі, якія былі атрыманы ад продажу ці іншага выплатнага адчужэння долі (паю, часткі долі або паю) у статутным фондзе арганізацыі іншай фізічнай асобе. Тут без варыянтаў. Іншая справа — падарункі.

Калі чалавек летась атрымліваў даходы ў выглядзе дарэння ад фізічных асоб, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, у памеры больш за 6116 рублёў ад усіх крыніц на працягу года, тады без дэкларацыі яму не абысціся. Падаткаабкладанню падлягае сума менавіта такога перавышэння. Пры гэтым падлічваецца кошт не толькі грашовых падарункаў, але і падараванай маёмасці, уключаючы нерухомасць.

Выключэнне складаюць падарункі сваякоў. Яны вызваляюцца ад падаходнага падатку незалежна ад памеру атрыманага ў выніку дарэння даходу.

Асобамі, якія знаходзяцца ў адносінах блізкага сваяцтва, лічацца бацькі (усынавіцелі), дзеці (у тым ліку ўсынаўленыя, удачараныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабуля, унукі, прадзед, прабабуля, праўнукі, муж і жонка. У адносінах сваяцтва будуць блізкія сваякі мужа ці жонкі, уключаючы памерлых.

ДАХОД АД АРЭНДЫ ЖЫЛЛЯ

Гэта датычыцца тых кліентаў інспекцый, хто ў мінулым годзе здаваў сваю ўласную кватэру на працяглы тэрмін і плаціў фіксаваны падатак. Цяпер яны павінны падлічыць даход ад здачы ў арэнду жылых і нежылых памяшканняў за ўсе 12 месяцаў. Калі ён дасягнуў агульнай сумы 6116 рублёў і больш, тады трэба наведаць падатковую інспекцыю. Такія даходы абкладаюцца падаходным падаткам па стаўцы 13 працэнтаў. Пры гэтым сумы падаходнага падатку ў фіксаваных сумах, выплачаныя за 2018 год, падлягаюць заліку пры вылічэнні падатку па стаўцы 13 працэнтаў.

ПРЫ СПЫНЕННІ БУДАЎНІЦТВА І ПАГАШЭННІ ЖЫЛЛЁВЫХ АБЛІГАЦЫЙ

Па выніках года дэкларуецца і даход, атрыманы грамадзянінам праз механізм вяртання раней унесеных сродкаў пры спыненні будаўніцтва жылля, а таксама ў выпадку патаннення такога будаўніцтва альбо выбыцця фізічнай асобы з членаў арганізацый забудоўшчыкаў.

Спецыялісты адзначаюць, што вернутыя пры гэтым грашовыя сродкі, у тым ліку паявыя ўзносы, абкладаюцца падаходным падаткам у выпадку, калі на такія ўзносы раней была дадзена льгота ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Трэба дэкларавацъ таксама і даходы, якія былі атрыманы ў выглядзе грашовых сродкаў пры пагашэнні (датэрміновым пагашэнні) жыллёвых аблігацый, а таксама ў выглядзе вяртання грашовых сродкаў, унесеных у аплату кошту жылога памяшкання шляхам набыцця жыллёвых аблігацый, у выпадку невыканання забудоўшчыкам абавязацельстваў па дагаворы. Дэкларацыя падаецца ў тым выпадку, калі па ўнесеных сумах для набыцця жыллёвых аблігацый раней быў праведзены маёмасны падатковы вылік.

Такім чынам, былы забудоўшчык, які атрымаў у мінулым годзе такія грашовыя сродкі, абавязаны заплаціць падаходны падатак у дачыненні да сум, на якія яму раней была выдзелена льгота ў выглядзе маёмаснага падатковага выліку.

Сяргей КУРКАЧ.

Антытытунёвая палітыка

Цыгарэты на касе прыбяруць?

Заканадаўства па курэнні стане больш жорсткае

Прэзідэнт падпісаў дэкрэт № 2. Новыя нормы павінны паступова абмежаваць даступнасць табачных вырабаў і папярэдзіць негатыўны ўплыў курэння на здароўе насельніцтва.

Дакумент карэкціруе дэкрэты № 28 ад 17 снежня 2002 года і № 4 ад 18 кастрычніка 2007 года. Ім прадугледжана заканадаўчае рэгуляванне вытворчасці, звароту і выкарыстання электронных сістэм курэння, а таксама прылад для нагрэву тытуню без яго гарэння ці тлення — сістэм для ўжывання тытуню. На такія сістэмы будуць распаўсюджвацца асобныя прававыя нормы, якія дзейнічаюць у дачыненні да тытунёвых вырабаў.

У прыватнасці, права на дзейнасць, звязаную з вытворчасцю і зваротам сістэм для ўжывання тытуню, электронных сістэм курэння і вадкасцяў для іх, даецца толькі суб'ектам гаспадарання Беларусі. Забараняецца адкрытая выкладка вадкасцяў для электронных цыгарэт у вітрынах і іншым гандлёвым абсталяванні. Нельга таксама рэкламаваць і прадаваць іх непаўналетнім. Будуць абмежаваны месцы продажу і выкарыстання электронных сістэм курэння.

У дэкрэце замацавалі пералік месцаў, дзе курыць забаронена. Гэта дапаможныя памяшканні жылых дамоў, ліфты, аўтамабілі, што перавозяць дзяцей да 14 гадоў, дзіцячыя пляцоўкі, працоўныя месцы ў памяшканнях, тэрыторыі і памяшканні спартыўна-аздараўленчых лагераў, устаноў адукацыі, падземныя пераходы, прыпынкі і пасадачныя пляцоўкі.

З 1 студзеня 2020 года ў крамах, гандлёвая плошча якіх большая за 1000 квадратных метраў, прадаваць тытунёвыя вырабы, сістэмы для ўжывання тытуню, электронныя сістэмы курэння і вадкасці для іх будуць толькі праз таварныя аддзелы. А з 1 студзеня 2022 года ў крамах і павільёнах забароняць выкарыстоўваць для захоўвання і продажу тытунёвых вырабаў абсталяванне над кантрольна-касавымі вузламі.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.